Галоўнае ўпраўленне па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Старадарожскі цэнтр дзіцячай творчасці «Святліца» імя І.Н.Стасевіча»

# ТВОРЧЫ ПРАЕКТ

# "ЖЫЦЦЁ ГЛІНЯНАЙ ПАСУДЫ. НАБОР ДЛЯ ГАРБАТЫ "ЗЯЛЁНАЯ ГАЛІНКА"»

Старыя Дарогі, 2019

Аўтар-складальнік
Поршнева В.А., педагог дадатковай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Старадарожскі цэнтр дзіцячай творчасці «Святліца» імя І.Н.Стасевіча»

Рецэнзент
Малец С.У., загадчык вучэбна-метадычнага кабінета ўпраўлення па адукацыі, спорце і турызме Старадарожскага раённага выканаўчага камітэта

**Творчы праект «Жыццё глінянай пасуды. Набор для гарбаты “Зялёная галінка”»** / аўт.-склад. В.А. Поршнева; Старадарожскі цэнтр дзіцячай творчасці «Святліца» имя І.Н. Стасевіча. – Старыя Дарогі, 2019. – 22 с.

У рабоце прадстаўлены творчы праект «Жыццё глінянай пасуды. Набор для гарбаты “Зялёная галінка”», выканаНы навучэнцамі студыі «Гліняныя дзівосы» дзяржаўнай установы адукацыі «Старадарожскі цэнтр дзіцячай творчасці «Святліца» імя І.Н.Стасевіча» для ўдзелу ў абласным этапе рэспубліканскага фестывалю-конкурсу праектаў навучэнцаў «Нашчадкі традыцый» у намінацыі «Сучаснасць і традыцыі: беларуская народная творчасць».

Адрасуецца педагогам і навучэнцам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама ўсім, хто цікавіцца народным мастацтвам.

© Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Старадарожскі цэнтр дзіцячай творчасці «Святліца» імя І.Н.Стасевіча», 2019

Змест


Пашпарт праекта…………………………………………………………… 4
УВОДЗІНЫ……………………………………………..……………….... 5
ЖЫЦЦЁ ГЛІНЯНАЙ ПАСУДЫ. НАБОР ДЛЯ ГАРБАТЫ “ЗЯЛЁНАЯ ГАЛІНКА” …………………….............................................................. 6

*З гісторыі беларускай глінянай пасуды*………………………………......... 6

*Разнастайнасць асартыменту і формаў глінянай пасуды*…........... 7

*Спосабы дэкарыравання глінянай пасуды*……………………………... 8

*Наш набор пасуды*………………………………………………… 10

ЗАКЛЮЧЭННЕ…………………………………………………............... 12
Літаратура……………………………………......................................... 13
Дадатак 1. *Эскізы пасуды з набора для гарбаты “Зялёная галінка”*…….. 14
Дадатак 2. *Тэхналагічная карта выканання выраба “Талерка”*…………. 15
Дадатак 3. *Тэхналагічная карта выканання выраба “Кубачак”*…………. 17
Дадатак 4. *Тэхналагічная карта выканання выраба “Чайнік”*……......... 19

Пашпарт праекта

| | |
|---|---|
| Назва праекта | Жыццё глінянай пасуды. Набор для гарбаты «Зялёная галінка» |
| Навучэнцы, удзельнікі калектыўнага праекта: прозвішча, імя, узрост | Барысоўская Анастасія, 13 гадоў<br>Палякова Вікторыя, 13 гадоў |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога, кіраўніка праекта | Поршнева Вольга Аляксандраўна |
| Аб'яднанне па інтарэсах | Народная студыя «Гліняныя дзівосы» |
| Тып праекта | Творчы, даследчы, |
| Адукацыйная вобласць праекта | Дэкаратыўна-прыкладная творчасць. Народныя рамёствы. Кераміка |
| Метады | Дослед, аналіз, праектаванне, гутарка, назіранне, майстар-клас, практычная работа |
| Установы і арганізацыі, ва ўзаемадзеянні з якімі выконваўся праект | Дзяржаўная ўстанова культуры «Старадарожскі цэнтр рамёстваў», дзяржаўная ўстанова «Старадарожскі гісторыка-этнаграфічны музей» |

# УВОДЗІНЫ

Яшчэ з даўніх часоў чалавек навучыўся ствараць гліняныя прадметы побыту, з цягам часу імкнуўся рабіць іх не толькі зручнымі для карыстання, але і прывабнымі. Ніштo не замяніць цеплыню і прыгажосць гліняных рэчаў, тым больш калі яны зробленыя сваімі рукамі… Мы, Барысоўская Анастасія і Палякова Вікторыя, з задавальненнем наведваем заняткі ў народнай студыі па кераміцы «Гліняныя дзівосы» Старадарожскага цэнтра дзіцячай творчасці, дзе навучыліся ляпіць з гліны дзіўныя рэчы: статуэткі, пано, сюжэтныя кампазіцыі. Мы робім падарункі для сваіх сяброў, родных і знаёмых, часта ўдзельнічаем у конкурсах і выстаўках па дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Здавалася, што мы ведаем пра кераміку ўсё, але аднойчы ў школе на ўроку мастацтва мы пачулі пра старажытную пасуду. Мы даведаліся, што з цягам часу пасуда змяняла матэрыял, свае формы і памеры, дэкаратыўнае аздабленне. Нас зацікавіў гліняны посуд. Пра свой інтарэс мы расказалі нашаму педагогу ў студыі па кераміцы. Вольга Аляксандраўна падтрымала нас і прапанавала нам прыняць удзел у конкурсе даследчых праектаў, падчас якога мы зможам не толькі яшчэ больш даведацца пра гісторыю керамікі, паходжанне глінянай пасуды, яе ўжыванне старажытнымі і сучаснымі людзьмі, але і выкарыстаць свае навыкі па рабоце з глінай, даць волю творчасці і фантазіі. Такая прапанова яшчэ больш заахвоціла нас да пошукава-творчай працы.

Мы наведалі раённы цэнтр рамёстваў, Старадарожскі гісторыка-этнаграфічны музей, перагледзелі шмат навуковых кніг на гэтую тэму. Аказалася, што гліняная пасуда за сваё жыццё вытрымала шматлікія пераўтварэнні ад простага да складанага і наадварот. Ва ўсе часы гліняная пасуда карысталася папулярнасцю як у галіне бытавога прызначэння, так і дэкаратыўнага. Нас зацікавілі пытанні: ці перайшлі да нашых дзён спосабы стварэння глінянай пасуды, ці захаваліся яе формы, ці з’явіліся новыя віды пасуды. Асабліва зацікавіла пытанне дэкору глінянай пасуды, калі мы выпадкова ўбачылі дзіўныя геаметрычныя арнаменты старажытнай глінянай пасуды. Нас да глыбіні душы ўразіла фантазія нашых продкаў. Як яны ўмелі ствараць бясконцую колькасць узораў са звычайных рысачак, квадрацікаў, ромбаў, кропак. Такое моцнае ў іх было жаданне ўпрыгожыць сваё жыццё! Накірункі нашай працы былі вызначаны.

Мэта нашай працы – паглыбленае вывучэнне гісторыі ўзнікнення глінянай пасуды, яе спосабаў стварэння і дэкору.

Задачы:

пашырыць веды па гісторыі ўзнікнення глінянага посуду;

даведацца аб прызначэнні, формах і відах глінянага посуду;

прааналізаваць спосабы дэкаратыўнага аздаблення глінянай пасуды ў розныя часы;

стварыць самастойна гліняны посуд.

Асноўнае пытанне працы: які спосаб дэкарыравання глінянай пасуды адраджаецца і мае распаўсюджанне ў сучасным свеце.

# ЖЫЦЦЁ ГЛІНЯНАЙ ПАСУДЫ. НАБОР ДЛЯ ГАРБАТЫ “ЗЯЛЁНАЯ ГАЛІНКА”

*З гісторыі беларускай глінянай пасуды*

Разнастайнасць вырабаў беларускіх народных майстроў-ганчароў – вынік шматвяковай гісторыі развіцця мастацтва керамікі. Масавая вытворчасць керамікі на тэрыторыі Беларусі адзначаецца ў эпоху неаліту – апошняга перыяду каменнага стагоддзя. Даследчыкі лічаць, што ўзнікненне керамікі звязана са звычаем абмазваць глінай плеценыя вырабы. Першабытныя людзі заўважылі, што, трапіўшы ў агонь, такое начынне не псуецца, а наадварот, станавілася яшчэ больш моцным, Гэта і падштурхнула да думкі вырабляць посуд з гліны і абпальваць яго на агні.

Асабліва значны крок наперад зрабіла керамічная вытворчасць у часы Кіеўскай Русі. У 10 стагоддзі на заходнерускіх землях набывае пашырэнне ганчарны круг, які даў магчымасць наладзіць масавую вытворчасць бытавога посуду, што аказала значны ўплыў на мастацкі бок вырабаў. Найбольшага росквіту ганчарнае рамяство дасягае ў 16-17 стагоддзях, што было звязана з ажыўленнем эканамічнага і сацыяльна-палітычнага жыцця, арганізацыяй прафесійных рамесніцкіх аб'яднанняў – цэхаў. Керамічная вытворчасць атрымлівае спецыялізаваны рамесніцкія характар, аб чым сведчаць шматлікія знаходкі цэлых вырабаў і іх фрагментаў з клеймамі, размешчанымі на вонкавым боку дна. Ганчарства цалкам пераходзіць у рукі рамеснікаў-мужчын. Адбываецца яго размежаванне на гарадское і сельскае, якое ярка праяўляецца і ў наступныя стагоддзі. У гэты час ганчарскія цэхі былі ў многіх гарадах Беларусі: Гродне, Брэсце, Полацку, Мінску, Капылі, Міры, Слуцку, Шклове, Стрэшыне, Камянцы. Калі сельскія ганчары па-ранейшаму задавальняюць уласныя патрэбы ў посудзе нешырокага асартыменту, выраблenага ў тэхніцы ручной лепкі, гарадскія рамеснікі актыўна авалодваюць больш дасканалымі сродкамі вытворчасці і працуюць на шырокае кола спажыўцоў. Таксама існавалі дробныя ганчарныя цэнтры, дзе працавала толькі па некалькі чалавек. Яны былі характэрныя для паўночнага захаду Беларусі, дзе даўжэй захоўваліся архаічныя віды вытворчасці і спосабы арганізацыі рамяства. Такіх майстроў-адзіночак яшчэ больш стала ў пачатку 20 стагоддзя, што было вынікам вострай канкурэнцыі паміж рамеснікамі, асабліва ў буйных гарадскіх і мястэчковых колах ганчарства. Хто не вытрымліваў спаборніцтва з больш моцнымі канкурэнтамі, вымушаны быў наймацца да іх у чаляднікі або перасяляцца ў больш слабыя вёскі, дзе можна было арганізаваць вытворчасць. У гэты час частка майстроў застаецца працаваць ў ганчарных цэхах, дзе вырабляюцца асобныя віды бытавых вырабаў, на якія яшчэ ёсць попыт. Найбольш працаёмкія механізаваныя вытворчыя працэсы адбываюцца ў цэхах па нарыхтоўцы і падрыхтоўцы фармовачнай масы, дзе значная частка прадукцыі выраблаецца шляхам штампоўкі на паўаўтаматах. Аднак гэта хоць і павышае вытворчасць працы ў шмат разоў, зніжае ролю майстра-творцы, ператварае яго ў звычайнага рабочага-выканаўцу. У наш час ганчарства існуе ў розных формах. Адна з іх –

народны промысел у сваім традыцыйным выглядзе. Другая – вытворчасць глінянай пасуды як адна з найбольш развітых галін у прамысловасці.

*Разнастайнасць асартыменту і формаў глінянай пасуды*

Шырокае прымяненне ганчарных вырабаў у побыце выклікала выпрацоўку самых розных формаў і відаў народнай керамікі. Выраб глінянага посуду быў прывілеяй жанчын, кожная з іх праяўляла ўласны густ. І хоць традыцыі асобных рэгіёнаў дыктавалі пэўныя заканамернасці формаўтварэння і арнаментацыі, кожны выраб быў па-свойму непаўторны і своеасаблівы, свабодная творчасць выяўлялася на поўную моц.

Значная разнастайнасць формаў і асартыменту керамікі адзначаецца ў бронзавым веку (мяжа 3-2 тысячагоддзяў – 7-6 стагоддзяў да нашай эры). Вастрадонныя гаршкі саступаюць месца акруглым і пласкадонным, пашырэнне набываюць міскі, кубкі розных памераў і форм. Многія вырабы як па сваім прызначэнні, так і па фармальных асаблівасцях вызначаюцца пэўнымі блізкімі якасцямі, што дазваляе ўвесь асартымент керамічных прадметаў падзяліць на некалькі груп. У этнаграфіі традыцыйную народную кераміку прынята дзяліць на шэсць асноўных груп: 1) кухонны посуд (для прыгатавання ежы), 2) посуд для захавання і транспарціроўкі прадуктаў, 3) сталовы посуд, 4) дэкаратыўная кераміка, 5) цацкі, 6) вырабы living рознага гаспадарчага прызначэння.

Варта адзначыць, што такая класіфікацыя досыць умоўная, адны і тыя вырабы часта можна аднесці да розных груп. Напрыклад, фігурныя сасуды ў выглядзе бараноў, ільвоў, мядзведзяў па сваіх фармальных асаблівасцях можна лічыць тыповым узорам дробнанай пластыкі, але адначасова яны былі і аздабленнем інтэр'ера, і скарыстоўваліся з практычнага боку: у іх можна было наліваць якія-небудзь вадкасці. Некаторыя віды гаспадарчага посуду – талеркі, міскі, збанкі, чайнікі – скарыстоўваліся на святы ці ў час прыходу гасцей, у іншыя дні стаялі на стале ці ў адкрытым пасудніку як упрыгожанне жылля.

Сталовая і кухонная пасуда здзіўляе разнастайнасцю асартыменту, самым масавым выглядам якой па-ранейшаму з'яўляюцца гаршкі. З цягам часу профіль іх стаў больш выразны, венцы плаўна адагнутыя, шыйка невысокая, плечыкі ярка выяўленыя. Значны працэнт кухоннага посуду складаюць патэльні на ножках, з ручкай, куды ўстаўлялася драўляная дзяржальня. Сталовы посуд уключае міскі і паўміскі рознай велічыні і аб'ёму, талеркі з роспісам, кубкі, куфлі, чаркі, сальнікі.

З часам ганчарная пасуда набывае больш зграбны і разнастайны па форме выгляд, яго паверхня часам даводзіцца да бляску, а дэкор становіцца больш упарадкаваны і рытмічны. Складваюцца асартымент і формы посуду, многія з якіх без істотных змен дайшлі да нашага часу.

Прызначэнне народнай керамікі прыкметна мяняецца ў сучасным побыце, асабліва гарадскім. Напрыклад, чыста гаспадарчыя пасудзіны – гляк, гладыш, гаршчок, цёрла – на выстаўцы народнага мастацтва ці ў сучаснай кватэры ўспрымаюцца як мастацкія рэчы, хаця іх стваральнікі такой мэты не ставілі.

*Спосабы дэкарыравання глінянай пасуды*

Калі мы заняліся адшукваннем адказу на пытанне якія спосабы дэкарыравання глінянай пасуды існавалі і існуюць зараз, пошукавая сістэма Яндэкс выдала нам вельмі вялікую колькасць інфармацыі. Прыйшлося шмат працаваць, у выніку чаго атрымалася наступнае.

Арнамент на глінянай пасудзе з’явіўся яшчэ ў неаліце, калі, праціраючы травою слеплены сыры гаршок, чалавек убачыў, што на паверхні сырой гліны застаюцца сляды – палоскі і рысачкі. Магчыма ў гэты момант і ўключылася фантазія першага мастака, які з цягам часу ўскладніў узоры, выціскаючы іх на сырой паверхні пасуды палачкай, костачкай ці каменьчыкам.

Першабытны чалавек імкнуўся ўпрыгожыць свае пакуль яшчэ не дастаткова зграбныя гліняныя вырабы. Практычна ўсе яны ўпрыгожаны арнаментам з простых формаў: ямак, накалоў, рысак. Іх разнастайнае камбінаванне стварае мноства варыянтаў дэкору. Асаблівага росквіту дасягае арнаментацыя керамічнага посуду ў познім неаліце. Нягледзячы на пэўныя адрозненні ў формах керамічных вырабаў розных племянных груп, на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў дэкоры паўтараюцца адны і тыя ж арнаментальныя матывы і элементы: трохвугольнікі, ромбы, ламаныя лініі, вуглы, а таксама салярныя знакі – канцэнтрычныя кругі, крыжы, праменепадобныя лініі. Як і дэкор у цэлым, апошнія звязаны з рэлігійнымі ўяўленнямі першабытных людзей і адлюстроўваюць тыя ці іншыя культы, у першую чаргу культ Сонца. Трапляюцца схематычныя адлюстраванні птушак, жывёл, людзей і нават цэлыя сюжэтныя сцэнкі.

Са зменай формаў і памераў пасуды ўскладняецца арнамент. Гліняны посуд упрыгожваюць шырокія паясы з трохвугольнікаў, квадратаў, ромбаў, крыжоў, дужак, якія чаргуюцца з вузкімі паяскамі з насяканняў і наколы. У позднебронзовый перыяд арнаментацыя спрашчаецца, часам знікае зусім. Сціпласць арнаментацыі характэрная і для керамікі жалезнага веку (7-6 стагоддзе да нашай эры – 8 стагоддзе нашай эры).

Арнамент на старажытнай пасудзе быў рэльефны: ён наносіўся на падсушаную, але яшчэ вільготную паверхню пры дапамозе розных інструментаў. Узор, які наносіўся тэхнікай прачэрчвання і накалвання на мяккую неабпаленую паверхню пасуды завостранай палачкай ці тарцом абломанай птушынай костачкі, называўся накольчаты. З канца неаліту распаўсюджваюцца грабеньчатыя штампы. Штамы рабіліся з дрэва, косці, камню, гліны ці ракавін. На яго тарцэ выразаліся 2-3 зубчыкі. Найбольш старажытнымі былі прыродныя зубчатыя арнаменціры: ракавіны, чэлюсці грызуноў. У бронзавым стагоддзі з’явіліся фігурныя штампы (крыж і зігзаг). Штампы прыстаўлялі пад прамым вуглом да паверхні вырабу і, злёгку прыціскаючы, уціскваді ў гліну. Камбініруючы і чаргуючы адбіткі ў вызначанай паслядоўнасці, атрымлівалі выразныя ўзоры. Калі ж штампікі з круглым ці прамавугольным сячэннем уціскалі ў гліну не пад прамым, а пад вострым вуглом, то ствараўся ўзор з дужкавобразных увагнутасцяў. Нягледзячы на прастату, такі ўзор выгадна падкрэсліваў форму глінянай

пасудзіны, прыдаючы ёй асаблівую выразнасць.

Да сёняшняга часу археолагі знаходзяць у паселішчах старажытнага чалавека чарапкі і, нават цэлыя пасудзіны, аздобленыя так званым тэкстыль-арнаментам – адбіткамі грубых тканін і рыбацкіх сетак. Гэта, бадай, самы старажытны від ціснення. Прынамсі, яго ахвотна выкарыстоўваюць сучасныя керамісты для стварэння вызначанай фактуры.

У 3 – пачатку 2 тысячагоддзя да нашай эры ў Еўропе была шырока распаўсюджана тэхніка ўпрыгожання пасуды адбіткамі шнура і вяроўкі. Шнуравы арнамент ствараўся шляхам уціскання ў гліну прутка, на які быў намотаны шнур. Размяшчаючы кароткія адбіткі шнура пад рознымі вугламі, ганчар ствараў з іх самыя розныя ўзоры.

Японскія ганчары аж да 20 стагоддзя выкарыстоўвалі для ўпрыгожання пасудзіны замест шнура тасьму, сплеценую з рысавай саломы. Толькі што створаную пасудзіну абмотвалі тасьмой, сушылі і адпраўлялі ў печку. У печцы салома згарала, а на абпаленай пасудзіне заставаліся паглыбленые адбіткі, якія стваралі на паверхні чарапка арыгінальную фактуру. Акрамя тасьмы для ціснення выкарыстоўваліся рысавае збожжа. У сценкі пасудзіны збожжа рыса ўціскалі так, што ўтвараўся ўзор, падпарадкаваны пэўнаму рытму. У такім выглядзе посуд змяшчалі ў печ. Пасля выгарання зерняў на паверхні пасудзіны заставаўся паглыблены ўзор.

Старажытныя майстры выкарыстоўвалі яшчэ адзін спосаб ўпрыгожання керамікі: адбіткі розных раслін, напрыклад, каласоў збожжа, травы, іголкі хвойных дрэў, разнастайныя ракавіны. Гэты спосаб аздаблення керамікі дайшоў да нашых часоў і вельмі зацікавіў нас. Ен здзівіў сваёй прастатою выканання і ў той час эффектным вынікам. Неабходна проста сабраць букет з ліствы і кветак, зрабіць іх адпячатак на гліне, а з гліны зрабіць талерку ці кубачак. Кветкі звянуць, а іх рэльефныя малюнкі абпаляцца ў печцы, пакрыюцца каляровым палівам і будуць доўга прыносіць радасць.

Мы вырашылі больш даведацца пра гэты спосаб дэкарыравання керамікі. Аказваецца зараз ён з хуткасцю набірае папулярнасць сярод прыхільнікаў мастацкай керамікі: такі посуд вельмі яркі і незвычайны, кожная талерачка і кубачак унікальныя, а тэхніка даволі простая, і засвоіць яе можа кожны.

Выпадкова праз інтэрнэт даведаліся, што ў Мінску жыве і працуе маладая мастачка-керамістка Вольга Угрыновіч, якая займаецца керамічнай фларыстыкай. Пазней пра яе мы знайшлі артыкул у часопісе «Лукошко идей». Вельмі ўразілі і натхнілі нас словы мастачкі-керамісткі: «Кожны раз адчыняеш печ і чакаеш цуда». Яе гліняная пасуда незвычайна прыгожая. Калекцыі пасуды Вольгі Угрыновіч аздоблены адбіткамі разнастайных раслін, што надае ім нейкую моцную прыродную энергетыку. Як гаворыць сама Вольга, яе творы ў асноўным носяць практычны характар: у адным аб’екце злучаецца функцыянальнасць і міні-арт. Калі гэта кубачак, то прыгожы і практычны. Але ёсць і калекцыі, якімі карыстацца нельга. У Вольгі Угрыновіч ёсць прыватны магазін аўтарскай керамікі, але гэта не проста магазін, а арт-студыя, дзе праходзяць майстар-класы па стварэнню глінянай пасуды і яе дэкарыраванню

пры дапамозе адбіткаў раслін. Гэта азначае, што мастацтва керамікі і такі спосаб дэкарыравання керамікі жыве і адраджаецца.

*Наш набор пасуды*

Ітак, мы вырашылі, што свой набор пасуды мы зробім з адбіткамі кветак, або галінак ці лісточкаў. Разам з тым наш набор пасуды будзе прызначаны для ўпрыгожвання інтэр'ера.

Спачатку мы вызначыліся з тым, з якіх прадметаў будзе складацца наш набор. Вырашылі, што гэта будзе кубак, талерка і чайнік. Пасля мы разважалі пра формы і памеры будучай пасуды. Калі вызначыліся, распрацавалі эскізы (дадатак 1), вылучылі найбольш прывабны варыянт. Пры распрацоўцы эскізаў, прыйшлі да высновы, што дэкарыраваць наш набор пасуды мы будзем галінкамі туі. Туя мае найбольш выразная рысы і прыдатная для тых, хто займаецца такой справай першы раз. Каб падтрымаць традыцыйны дэкор, вырашылі скарыстацца арнаментам у выглядзе крыжыкаў і кропак. Далей выбралі колер глазуры, якой будзем афарбоўваць адбіткі. Выбар упаў на зялёны, бо ў большасці народаў ён азначае сімвал прыроды, самога жыцця, існасці, вясны. Пасля такой працы мы вызначыліся, што наш набор для гарбаты будзе называцца «Зялёная галінка».

*Падрыхтоўка гліны*

Гліну чыстую, без прымешак пяску і камянёў здрабняюць на кавалачкі і заліваюць гарачай вадой. Калі гліна добра насычыцца вадою іператворыцца ў «кашу», вымешваюць яе драўлянай лапаткай, а потым рукамі, пакуль гліняная маса не будзе падобная на цеста. Гатовая гліна не прыліпае да рук і трымае вылепленую форму. Гатовую гліняную масу фасуюць кавалкамі і змяшчаюць у поліэтыленавы пакет, які герметычна завязваюць. У такім стане гліна можа захоўвацца каля года. Пасля выкарыстання яе неабходна змочваць вадой.

Неабходна адзначыць, што ў гуртку мы працуем з глінай, якая прайшла ачышчальны працэс вытворчым шляхам праз спецыяльныя машыны на керамічнай фабрыцы.

*Спосаб лепкі*

Ляпіць пасуду з гліны мы будзем ручным спосабам шляхам раскатвання пласта, фармавання неабходнай формы выраба, апрацоўкі пальцамі. Посуд нельга дапаўняць шматлікімі дэталямі, так як, яны могуць паламацца ў працэсе сушкі. Посуд нельга змочваць вадой, так як гліна раскісне і выраб дэфармуецца. Калі ёсць муфельная печка, то гатовы выраб трэба абпаліць, папярэдне добра высушыць на працягу 2-3 сутак пры пакаёвай тэмпературы.

*Творчая праца*

Пачынаючы практычную частку нашай праектна-даследчай працы, мы, выкарыстоўваючы набытыя на занятках студыі веды, уменні і навыкі працы з глінай, распрацавалі тэхналагічныя карты выканання вырабаў «Талерка» (дадатак 2), «Кубачак» (дадатак 3) і «Чайнік» (дадатак 4).

Самым цікавым этапам нашай працы была лепка пасуды тым метадам, якім ляпілі яе старажытныя людзі: камяк гліны раскатвалі ў круглую аладку, а

затым у ёй проста загіналі край. Так, як і першыя людзі, мы дэкарыравалі пасуду пры дапамозе галінак. Такая праца несла нейкае асаблівае пачуццё, разуменне блізкасці гісторыі нашых продкаў. У той самы час мы скарыстоўвалі ў працы сучасныя магчымасці: ляпілі пасуду з ачышчанай вытворчым шляхам гліны, абпальвалі вырабы ў муфельнай печцы, пакрывалі іх глазурай. Атрымаўся незвычайны дэкаратыўны набор для гарбаты, пра этапы стварэння якога мы расказалі ў відэаролiку.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Мы лічым, што мэта нашай даследчай працы дасягнута. Мы пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення глінянай пасуды, спосабамі яе стварэння і дэкарыравання, даведаліся шмат цікавых фактаў зараджэнне керамікі на Беларусі, яе этапах станаўлення. Аказалася, што, з'явіўшыся многія тысячагоддзі таму назад, гліняная пасуда не толькі ні страціла сваёй актуальнасці, але і ператварылася ў прадмет высокай цікавасці з боку сучаснага чалавека. Мы пераканаліся самі і паказалі іншым, што зараз можна стварыць гліняную пасудзіну, выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі, і захаваць у іх традыцыі керамікі і арнаментацыі. Таксама мы можам з упэўненнасцю сцвярджаць, што большасць спосабаў дэкарыравання глінянай пасуды, яе формы, віды і спосабы стварэння, якія прыйшлі да нас са старажытных часоў, жывуць і маюць пачэснае месца ў сучаснай кераміцы.

Можна толькі меркаваць, калі быў упершыню раскручаны ганчарны круг, але з упэўненасцю можна сказаць – яго бег не спыняецца і зараз.

Літаратура

1. Сахута, Я. М. Беларуская народная кераміка / Я. М. Сахута. – Мінск: Полымя,1987.

2. Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1997.

3. Сахута,Я.М. Народныя мастацкія рамёствы Беларусі / Я.М. Сахута. – Мінск,2001.

4. Федотов, Г. Основы художественного ремесла / Г.Федотов. – М.,1997.

5. Этнографія Беларусі /І.П. Шамякін [іінш.]; пад рэд. І.П. Шамякіна.– Мінск,1989.

Дадатак 1

*Эскізы пасуды набора для гарбаты «Зялёная галінка»*





Дадатак 2

*Тэхналагічная карта выканання выраба «Талерка»*

1.Рыхтуем матэрыял: кавалак размятай, апрацаванай гліны, шлікер, пэндзлік, палачку, губку, разец.



2.Раскатваем пласт гліны і абразаем яго у форме круга, дыяметр якога павінен адпавядаць памеру будучай талеркі. Кладзём на атрыманы пласт галінкі туі і пракатваем качалкай так, каб яны адцiснулiся на гліне.



3.З дапамогай разца здымаем галінкі. У сярэдзіне адціскаем круг меншага дыяметру для дэкору цэнтра талеркі.



4.Беражок круга ўздымаем і пальцамі робім націскі, як бы расцягваючы, каб атрымалася хвалістая форма.



5.Па контуру ўнутранага круга з дапамогай разца ствараем арнамент у выглядзе крыжыкаў і кропак.



6.Гатовы выраб замываем вільготнай губкай.





7.Высушаную і абпаленую талерку пакрываем глазурай. Яшчэ раз адпраўляем у печ.



Дадатак 3

*Тэхналагічная карта выканання выраба «Кубачак»*

1.Рыхтуем матэрыял: кавалак размятай, апрацаванай гліны, шлікер, пэндзлік, палачку, губку, разец.



2. Раскатваем пласт гліны і абразаем яго у форме круга. Кладзём на атрыманы круг галінкі туі і пракатваем качалкай так, каб каб яны адціснуліся на гліне. Акуратна здымаем галінкі.



3.З дапамогай спецыяльнай формачкі-балванкі з пласта гліны робім форму кубачка.





4.Беражкі кубачка замазваем шлікерам і выраўніваем.



5.Па верхнім краі кубачка па перыметру з дапамогай разца наносім арнамент.



6.Каб зрабіць ручку кубачка, раскатваем жгуцік, адразаем неабходную даўжыню, згібаем у патрэбную нам форму і прыклейваем да кубачка, працарапваючы і змазваючы месца сутыкнення шлікерам.



7.Высушаны і абпалены кубачак пакрываем глазурай. Яшчэ раз адпраўляем у печ.



Дадатак 4

*Тэхналагічная карта выканання выраба «Чайнік»*

1.Рыхтуем матэрыял: кавалак размятай, апрацаванай гліны, шлікер, пэндзлік, палачку, губку, разец.



2.Раскатваем два пласта гліны: для чайніка і для крышкі чайніка.



3.Кладзём на адзін з атрыманых кругоў галінкі туі і пракатваем качалкай так, каб яны адціснуліся на гліне. Акуратна здымаем галінкі.



4.З дапамогай спецыяльнай формачкі-балванкі з пласта гліны робім форму чайніка.



5.Гатовы выраб выраўніваем і замываем вільготнай губкай.



6.Для носіка чайніка раскатваем невялікі пласт гліны, скручваем яго ў форме конуса, злучаем краі конуса шлікерам. Шырэйшую частку конуса зразаем накасяк.



7.У чайніку выразаем дзірачку для носіка. Месца злучэння носіка з чайнікам працарапваем, змазваем шлікерам. Дэталь носіка прыклейваем да чайніка.



8.Каб зрабіць ручкі чайніка, раскатваем жгуцік, адразаем ад яго два кавалка неабходнай даўжыні, згібаем іх у патрэбную нам форму і прыклейваем да чайніка, працарапваючы і змазваючы шлікерам месца сутыкнення.



9.Па верхнім беражку чайніка з дапамогай разца наносім арнамент.



10.На другім раскатаным крузе гліны выразаем невялікі сектар. Злучаем бакі, атрыманыя ад выразаннага сектара, надаючы форму крышкі. Па краі крышкі пальцамі робім націскі, ствараючы хвалю.



11.Для таго, каб крышка не падала з чайніка, раскатваем жгуцік і прыклейваем яго з вонкавага боку крышкі.





12.Каб было зручней трымаць крышку, на яе вярхушку прымацоўваем шарык.



13.Высушаны і абпалены чайнік пакрываем глазурай. Яшчэ раз адпраўляем у печ.



**Творчы праект**
**«Жыццё глінянай пасуды. Набор для гарбаты “Зялёная галінка”»**

Камп’ютарная вёрстка, дызайн вокладкі: Н. К. Бярэзіна, С.М.Емяльянава

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Старадарожскі цэнтр дзіцячай творчасці «Святліца»
імя І. Н.Стасевіча»

222932, г. Старыя Дарогі, вул. Карла Маркса, 30 «Б»
тел.: 807192 39858
e-mail: svetlitsa_stdorogi@tyt.by
сайт: https://svetlitsa.starye-dorogi.by